П. А. Ковальчук

# КЕЙДАНСКАЯ ЎНІЯ

Кейданская ўнія 1655 г. – дзяржаўная ўнія паміж ВКЛ і Шведскім каралеўствам, заключаная ў ходзе вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. і Паўночнай вайны 1655–1660 гг. Афармлена 20–23 кастрычніка 1655 г. ў Кейданах 3 актамі: дэкларацыяй ВКЛ да міжнароднай супольнасці з тлумачэннем прычын разрыву ўніі з Польшчай (20 кастрычніка 1655 г.); уласна артыкуламі ўніі (20 кастрычніка 1655 г.); актам пра стварэнне з дэпутатаў шляхты Рады Шведскай Літвы (23 кастрычніка 1655 г.). За час, які прайшоў ад прыняцця Кейданскай дэкларацыі 17 жніўня 1655 г., палітычнае становішча ВКЛ і Польшчы рэзка змянілася. Расія і казакі кантралявалі большую частку ВКЛ са сталіцай Вільняй. 8 верасня 1655 г. перад шведскім войскам капітулявала Варшава, 25 верасня – Кракаў. На пачатак кастрычніка 1655 г. значная частка Польшчы і поўнач ВКЛ былі пад кантролем Швецыі. У гэтых умовах шведскія палітыкі атрымалі магчымасць дыктаваць свае ўмовы. З другога боку, Расія зразумела, што адмова ад палітычнага дыялога і стаўка толькі на сілу была памылковай. 24 жніўня 1655 г. у лагер войска ВКЛ каля Кейданаў быў пасланы В. Ліхараў з граматай цара, у якой Я. Радзівілу і В. Гасеўскаму прапанавалася прыняць пратэкцыю Масквы ў абмен на захаванне пасад, уладанняў і свабоду веравызнання. 3 верасня 1655 г. цар прыняў тытул вялікага князя літоўскага. У пачатку кастрычніка 1655 г. палітычную кансультацыю з прадстаўнікамі Расіі па загадзе Радзівіла пачаў староста ашмянскі А. Саковіч. Шведскія палітыкі былі ўстрывожаны тым, што войска і рэшта ВКЛ могуць перайсці пад расійскі кантроль. Гэта трывога дала Радзівілу магчымасць ціснуць на шведаў пры абмеркаванні умоў уніі. 17 верасня 1655 г. у Посваль разам з 2-тысячным войскам прыбылі дамаўляцца пра ўнію "пасол караля Швецыі ў Літве"Бенгт Шутэ і маршал Густаў Левенгаўпт. Але перагаворы зацягнуліся. Не звязаная кліенцкімі адносінамі з слуцкабіржанскімі Радзівіламі шляхта баялася дамінавання гэтага роду ў дзяржаве. Шмат шляхты было за пратэкцыю на шведскіх умовах і выступала супраць умацавання Радзівілаў. Радзівіл быў супраць ідэі пратэкцыі і змагаўся за раўнапраўную ўнію паміж ВКЛ і Швецыяй. Шутэ распрацаваў план адхілення Радзівіла ад перагавораў: трэба было пазбавіць Радзівіла пасады вялікага гетмана і зрабіць яго ганаровым кіраўніком ВКЛ. Але Дэлагардзі адхіліў гэты план. 2 тыс. шведскіх жаўнераў на чале з ім дэманстратыўна рушылі на Кейданы. Тут пад націскам Дэлагардзі быў падпісаны першы акт Кейданскай уніі. "Публічная дэкларацыя ВКЛ да міжнароднай супольнасьці"(падпісалі каля 1060 шляхціцаў) і артыкулы "вечнай уніі Літвы са Швецыяй". Шведскі бок прадстаўлялі Дэлагардзі і Шутэ. Магнаты, шляхта і клір ВКЛ выступалі ад імя ўсёй дзяржавы. Яны адзначалі, што пасля прыняцця ў жніўні 1655 г. першапачатковага акта цяпер складзены канчатковы дакумент, у якім абвяшчалася "вечная"ўнія са Швецыяй, шведскі кароль Карл X прызнаваўся вялікім князем літоўскім, усе папярэднія уніі з Польшчай скасоўваліся. Будучыя каралі Швецыі аўтаматычна станавіліся вялікімі князямі літоўскімі. ВКЛ і Жамойці (яна згадвалася асобна) захоўвалі аўтаномію, любыя змены законаў з боку караля Швецыі павінны былі вырашацца на вальным сойме. У ВКЛ захоўвалася свабода веравызнання і ўсе правы рымска-каталіцкай, уніяцкай і праваслаўнай цэркваў. Гарантавалася сенатарская годнасць рымска-каталіцкіх біскупаў. Кароль Швецыі абвяшчаўся вярхоўным патронам усіх царкоўных маёнткаў. Войска ВКЛ падпарадкоўвалася каралю Швецыі. Ён меў прэрагатывы заключаць мір і аб'яўляць вайну. Непасрэднае кіраўніцтва ВКЛ пераходзіла да прызначанага каралём намесніка. ВКЛ пагаджалася ваяваць супраць Польшчы. Літвіны больш не прэтэндавалі на ўнію на роўных умовах. Умовы Кейданскай уніі падпісалі 1172 прадстаўнікі ВКЛ. Змяніўся ў параўнанні з Кейданскай дэкларацыяй 1655 г. спісураднікаў і вайскоўцаў, якія падпісалі дагавор. Няма подпісаў вышэйшых афіцэраў, якія перайшлі на бок Рэчы Паспалітай ці цара. Але Радзівіл здолеў пашырыць прадстаўніцтва ураднікаў (з 45 да 75) і афіцэраў. Кейданскую унію падпісала таксама вялікая група лютэранскіх баронаў з Інфлянтаў, што належалі Рэчы Паспалітай. Дэлягардзі і Шутэ былі задаволены ўніяй, хоць пад рэальны кантроль шведскага караля перайшла толькі частка ВКЛ: Жамойць, Вількамірскі, Упіцкі, Браслаўскі паветы і паўночная частка Ковенскага павета. Адміністрацыйным цэнтрам шведскай зоны ВКЛ была Рыга. Кейданская ўнія не была ратыфікаваная каралём і соймам Швецыі, але мела рэальную вагу на поўначы ВКЛ і стала адной з прычын разрыву Расіяй міру са Швецыяй і яе агрэсіі супраць шведскіх правінцый Лівонія, Інгрыя, Эстонія і Карэлія у ліпені 1656 г.

1. Вялікае княства Літоўскае. Энцыклапедыя: у 3 т. – Мінск, 2006. – Т. 2. – С. 81 – 84

*Ковальчук Павел Андреевич*, БГУИР, ФКП, ИПиЭ, isnovamoinikzanyat@gmail.com

*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, зав.кафедрой гуманитарных дисциплин, к. и. н., доцент



Библиотека БГУИР